таксама праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. У Беларусі ў 2013/14 навуч. г. 125 дзярж. і 12 прыватных К.

**КАЛЕКТЫВІЗМ**, рыса, форма і прынцып арганізацыі грамадскай дзейнасці і грамадскіх адносін; прынцып маралі, які раскрывае адносіны ўзаемадзеяння паміж людзьмі, асобай і калектывам, чалавекам і грамадствам. Мае шэраг гіст. форм. У стараж. грамадстве яго матэрыяльнай асновай з'яўлялася абшчынная ўласнасць з калект. размеркаваннем прадуктаў працы, роўнасцю ўсіх чл. абшчыны. Ва ўсх.-еўрап. краінах, у т.л. ў Беларусі, формай праяўлення К. была сельская абшчына (грамада), якая прадугледжвала роўнасць усіх яе чл., самакіраванне, вырашэнне грамадскіх спраў на агульным сходзе і інш. Формамі К. былі таксама рус. арцель, бел. *талака*, пазней — брыгадны падрад, калгас і інш. Для К. характэрны сумесная праца, супрацоўніцтва, узаемадапамога і ўзаемападтрымка, усведамленнне і выкананне чалавекам сваіх абавязкаў перад інш. людзьмі, грамадствам, свядомае спалучэнне грамадскіх інтарэсаў з асабістымі і інш. Ён прадугледжвае такія адносіны паміж грамадствам і асобай, пры якіх развіццё грамадства стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця асобы, яе свабоды выбару і свабоды дзеяння. Процілегласць К. — *індывідуалізм.*

*А.І.Галаўнёў.*

**КАЛЕКТЫЎНАСЦЬ ФАЛЬКЛОРУ**, галоўная ўласцівасць працэсу стварэння, бытавання і выканання фалькл. твораў. Праяўляецца ў пастаянным адборы лепшых твораў, сугучных думкам і эстэтычным поглядам народа, у пэўных фалькл.-эстэтычных нормах, характэрных для кожнага гіст. этапу, у межах якіх ствараецца, шліфуецца кожны новы твор і ў багацці маст. адлюстравання рэчаіснасці, накопленым стагоддзямі. Пераходзячы ад пакалення да пакалення, фальклор адкідвае ўсё выпадковае, наноснае і пакідае ў традыцыі толькі тое, што адпавядае ідэйна-маст. імкненням калектыву. К.ф. трэба разглядаць у суадносінах з інш. прыметамі фальклору, у якіх яна праяўляецца. Вылучаюць варыянтнасць, ананімнасць, традыцыйнасць і вуснасць. Варыянтнасць у фальклоры з'яўляецца вынікам калектыўнасці творчасці. Варыянты адрозніваюцца адзін ад аднаго ў дэталях, аднак рэалізуюць адзіную і агульную для ўсіх задуму вуснага твора. Ён уяўляе сабой адзінства, якое прадстаўлена ў разнастайнасці варыянтаў, што прымаюцца многімі людзьмі (калектывам). Спецыфіка прыметы ананімнасці заключаецца ў тым, што першапачаткова твор канкрэтнага аўтара (што магчыма) перадаваўся ад асобы да асобы і не застаўся вольным ад уздзеяння характэрных для К.ф. традыцый. Традыцыя ў фальклоры — заўсёды вынік непасрэднага пераймання з папярэдняй калект. творчасці. Вуснасць выпрацавала такія традыц., кампазіцыйныя і стыліст. прыёмы, якія дапамагалі слухачам успрымаць творы, запамінаць іх, а нар. спевакам і казачнікам ствараць новыя. Такія творы замацоўваліся ў памяці, не былі складанымі, засвойваліся адразу пры праслухоўванні. Працэс вуснага выканання і ўспрымання фальклору слухачамі заўсёды носіць калект. пачатак. Калектыўнасць не супрацьстаіць індывід. пачатку, не перашкаджае праяўленню індывід. здольнасцей выканаўцаў і складальнікаў. Неабходна дакладна адрозніваць паняцце індывід. творчасці, г.зн. творчасці непаўторнай, са сваімі ідэямі, вобразамі, сюжэтамі, стылем, і паняцце асабістага ўдзелу або ўкладу асобнага чалавека ў калект. творчасць. Першы від творчасці адносіцца да л-ры, другі — да фальклору. У ім творчасць асобных выканаўцаў перадае калект. светапогляд і псіхіку. Стваральнік у фальклоры не вольны ў самавыяўленні, ён існуе ў рамках законаў калект. творчасці. Тое ж самае адносіцца і да імправізацыі, якая магчыма пры ўмове абагульнення і ўзнаўлення ў маст. творчасці калектыўнасці у выніку доўгага і скрупулёзнага засваення вобразнасці, паэт. прыёмаў, розных сродкаў выяўлення рэчаіснасці. У гэтых імправізацыях індывідуальнасць выканаўцы твора зліваецца з творчасцю калектыву, не супярэчыць яму, не прыводзіць да перавагі індывід. своеасаблівасці. У наш час К.ф. застаецца гал. умовай яго існавання і выканання.

*Літ.*: Аникин В.П. Фольклор как коллективное творчество народа. М., 1969; Беларуская вусна-паэтычная творчасць. Мінск, 2000.

*А.М.Аляхновіч.*

**КАЛЕКТЫЎНЕНСКАЯ МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА**, помнік архітэктуры барока ў пас. Калектыўнае Полацкага р-на. Пабудавана ў 18 ст. з цэглы. У 2-й пал. 19 ст. праведзена рэстаўрацыя. Крыжова-купальны храм. На перакрыжаванні 2-схільных дахаў узведзены 8-гранны драўляны барабан, накрыты купалам з макаўкай, над бабінцам — 2-ярусная 4-гранная шатровая званіца з макаўкай. Фасады прарэзаны лучковымі аконнымі і ўваходнымі праёмамі ў ліштвах з замкавым каменем, апяразаны прафіляваным карнізам, крапаваны вуглавымі слаёнымі лапаткамі. Унутры сцены ў ніжнім ярусе крапаваны лучковымі нішамі. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае.

**КАЛЕНДА** Гаўрыіл (Габрыэль; каля 1606, Вільня — 18.11.1674), уніяцкі рэлігійны дзеяч Рэчы Паспалітай. З бел. шляхецкага роду герба «Бэлты». У 1626 уступіў у ордэн базыльян. Вучыўся ў калегіумах Брунсберга (цяпер г. Бранева, Польшча; 1627—30), Вены і Рыма (1633—39). У 1633 пасвячоны ў святара. У 1642—55 пры мітрапаліце А.Сяляве, з 1653 каад'ютар полацкага архіепіскапа. У 1655—74 архіепіскап полацкі. З 1655 адміністратар Кіеўскай мітраполіі, з